# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 4 (34) СНЕЖАНЬ 2016**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*



## Зіма на бацькаўшчыне

*Дзень цэлы плавалі вятры*
*Над восенню палёў бязмежных,*
*Пад вечар снегам завірыў*
*Спазніўшыся кудлаты снежань.*
*Ён ахінуў стагі лугоў,*
*Як верацёны, снежнай воўнай,*
*З-пад Налібок, з балот, лясоў*
*Плыты ільдзін пагнаў па Нёмну.*
*Ён хвалі дрэмлючай раллі*
*Рвануў за вараныя грывы, —*
*І ажылі, і паплылі*
*На бор уздыбленыя нівы.*
*Але навалу хмар цяжкіх*
*Стрымалі выгнуўшыся хвоі.*
*Адно па соснах залатых*
*Узнялося полымя сівое,*
*У змрочных лапках зацвіло,*
*З бяроз успыхнуўшага веццял*
*На сухастой, на буралом*
*Яго панёс аслепшы вецер.*
*Збудзіўся нетраў цёмны гул,*
*З лагоўяў воўчых і выкопаў*
*Папоўз па свежаму снягу,*
*Па выбітых руёю тропах.*

*Зіма... Ад інею вішняк*
*Перахіліўся за парканы.*
*І не мінеш яго ніяк,*
*Кранеш — і цветам серабраным*
*Асыпе з галавы да ног.*
*На дзенніві вароны стадам*
*Лятуць з прасёлачных дарог.*
*Іх цень плыве праз палісады,*
*Дзе ўсё, як вогнішча лістоў,*
*Замёў снег свежы, сшаранелы,*
*Дзе першых заячых слядоў*
*Глухія петлі забялелі.*
*Калі-ж, вячэрняю парой,*
*За вёску выйдзеш на прыволле,*
*Цябе сустрэнуць чарадой*
*Шляхоў знаёмыя таполі,*
*Пачуеш як трашчыць рака,*
*Скрыпяць асверы на марозе,*
*Як пад дугой маладзіка*
*Пяюць сялянскія палозззя.*
*І шляху зорнага агні*
*У кожнай у сняжынцыззяюць*
*І ў сэрцы, што з далечыні*
*Па родным сумавала краю.*

*Максім Танк*

**Фота Ірыны Маркевіч**

# Казка "ВІЧ і яго мара"




У далёкай змрочнай краіне ХВАРОБА жывуць мікробы, бактэрыі і вірусы. У кожнага з іх свой дом, свае ўладанні. Але ўсе яны мараць перасяліцца ў чалавечы арганізм і атрымаць перамогу над здароўем чалавека і яго памочнікамі — абаронцамі лімфацытамі і добрымі бактэрыямі.

На самым краі ХВАРОБЫ ў высокім замку жыў самы моцны і страшны з усіх вірусаў — ВІЧ — Вірус Імунадэфіцыту Чалавека. Яго пабойваліся нават самыя страшныя і суровыя вірусы. Бо ён валодаў загадкавай сілай. ВІЧ немагчыма перамагчы. Затое ён здольны перамагчы імунную сістэму чалавека.

І хоць іншыя вірусы і мікробы маглі папросту пераходзіць ад аднаго чалавека да другога падчас чхання, кашлю, прадметы асабістага ўжытку, і маглі так заразіць значна больш людзей. ВІЧ быў страшней. Бо менавіта ён забіваў смелыя лімфацыты, якія дружна змагаюцца з усімі мікробамі і актыўна іх перамагаюць. Усіх, акрамя ВІЧ.

Вось чаму яны хацелі з ім сябраваць. Бо калі ён пускаў іх разам з сабой у адзін арганізм, нават самы кволы мікроб мог цалкам заняволіць чалавека. Чаму? Таму што пасля таго, як ВІЧ абясшкодзіць абаронцаў чалавечага арганізма — лімфацытаў, кроў чалавека становіцца безабароннай перад любымі вірусамі і мікробамі.

Вось аднойчы, сядзеў ВІЧ у сваёй высачэзнай вежы і выглядаў у свой чароўны бінокль цела, якое б падыходзіла для яго жыццядзейнасці. Для ВІЧ самае складанае — гэта патрапіць у арганізм. Бо яму трэба пранікнуць адразу ў кроў, праз ранкі і ўколы.

І вось у аб'ектыве ВІЧ ўбачыў Чалавека. Ён яму спадабаўся. Бо той ляжаў дзесьці пад плотам, у ірванай адзежы, з пустым позіркам … і самае галоўнае — са шпрыцом у руках! Вось ён — любімы і самы лёгкі шлях пранікнення ВІЧ — іголка наркамана.

Сеў ВІЧ у сваю карэту і на максімальнай хуткасці памчаўся да сваёй мэты. За ім следам паплялася чарада вірусаў і мікробаў. Дабраўся ВІЧ да Чалавека пад плотам. А тут да яго яшчэ адзін падышоў. ВІЧ радаваўся! Адразу два арганізма трапяць цяпер у яго чэпкія абдымкі.

ВІЧ ўжо прадставіў, як ён сядзе на краёчак іголкі і Чалавек сам ўпусціць яго ў сваю кроў. Ён заплюшчыў вочы і з радасцю стаў маляваць сабе карціны, як ўцякаюць ад яго гэтыя смельчакі — лімфацыты, якіх баяцца ўсе жыхары ХВАРОБЫ, а ён наганяе іх усіх і праколвае сваёй маленькай вострай шпагай. Ён такі маленькі, перамагае іх усіх і вяршэнствуе арганізмам чалавека. Пакуль яму будзе камфортна, ён будзе сядзець і атрымліваць асалоду ад сваёй улады, а калі надакучыць, адкрые дзверы прастудзе ці грыпу, або сухотнай палачцы і тады...



Але тут летуценні ВІЧа былі перапынены. Іголку, на якую ён ужо залез, падняў Чалавек у белым халаце, папярэдне надзеўшы на рукі пальчаткі, і выкінуў у бліжэйшы смеццевы кантэйнер. А Чалавека, які ляжаў пад плотам, клапатліва падняў, пасадзіў у машыну з чырвоным крыжам і надпісам «Хуткая дапамога» і павёз.

Калі ВІЧ праз некалькі тыдняў нарэшце выбраўся на паверхню кантэйнера, то ўбачыў Чалавека, які праходзіў міма. Таго самага, у якога ён хацеў пасяліцца, але зусім зрененага. У яго была бадзёрая хада, здаровы колер твару … і самае галоўнае — бляск у вачах і ўсмешка на вуснах! Для ВІЧ — гэта самае страшнае. «І гэты пайшоў», — сумна ўздыхнуў Вірус і пайшоў да сябе дадому.



А той самы Чалавек ішоў у школу, дзе ён дзяліўся з дзецьмі сваёй гісторыяй. Чалавек распавёў ім самае галоўнае, што трэба рабіць, каб не ўпусціць у свой арганізм ВІЧ і не захварэць СНІДам:

- ✓ Ніколі не дакранайцеся да знойдзеных на вуліцы шпрыцоў.
- ✓ Ніколі не паддавайцеся на ўгаворы паспрабаваць наркотык.
- ✓ Сцеражыцеся траплення чужой крыві на скуру, асабліва калі яна пашкоджана.
- ✓ Калі вы атрымліваеце медыцынскае лячэнне, памятаеце: ўсе іголкі і шпрыцы павінны быць аднаразовымі!
- ✓ І яшчэ маленькая парада: дапамагайце сваім блізкім!

***Матэрыял падрыхтавала Вольга Жук***



## *Што такое ВІЧ і СНІД?*

*ВІЧ — гэта вірус, які прыводзіць да пашкоджання імуннай сістэмы арганізма. А імунная сістэма, як вядома, абараняе арганізм ад розных інфекцый. Калі імунная сістэма працуе дрэнна, чалавек не можа змагацца з многімі сур'ёзнымі захворваннямі.*

*Негатыўныя наступствы заражэння могуць выявіцца праз некалькіх месяцаў, а часам гэта адбываецца адразу — калі новanароджаныя з'яўляюцца на свет, ужо з ВІЧ-інфекцыяй. У дарослых, якія жывуць з ВІЧ, паражэнне імуннай сістэмы можа адбывацца больш павольна. Пра людзей з ВІЧ кажуць, што ў іх СНІД, калі іх імунная сістэма значна пашкоджана або калі ў іх з'яўляюцца ВІЧ-асацыяваныя інфекцыі альбо рак.*

# Снегавік: гісторыя з'яўлення, сімвал, дзень

***Зіма... Снег... Выдатная магчымасць павесяліцца: згуляць у снежкі, спусціцца з неверагоднай горкі на санках, пакатацца на лыжах, здзейсніць незвычайны трук на каньках. Але калі мароз крыху здаў свае пазіцыі – ідэальныя ўмовы вясёлай кампаніяй зляпіць пацешнага снегавіка... А маглі б вы падумаць, што гэты, звыклы кожнаму, зімовы казачны калабок, неад'емны атрыбут зімовага парку або двара, мае вельмі цікавую гісторыю і незвычайныя традыцыі ў розных краінах?***



## Гісторыя снегавіка

Гісторыя стварэння першага снегавіка, паводле старадаўняга падання, пераносіць нас у далёкі 1493 год. Менавіта тады Мікеланджэла Буанароці, скульптар, паэт і архітэктар, зляпіў першую снежную фігуру. А вось першае пісьмовае згадванне аб прыгожым велізарным снегавіку сустракаецца ў адной з кніг 18 ст.

## Што сімвалізаваў снегавік? І якія традыцыі, звязаны са снегавікамі?

У былыя часы зіма, суровыя маразы прыносілі масу непрыемнасцяў і клопатаў чалавеку. Тады і з'явілася павер'е аб пагрозах, якія можа нанесці людзям своеасаблівая скульптура са снегу. Таму і малявалі снегавікоў велізарнымі снежнымі монстрамі.

Нарвежцы, да прыкладу, баяліся сустрэць снегавіка вечарам. Гэта абяцала нейкае няшчасце.

Існавала таксама павер'е, што злеплены ў поўню снегавік можа прынесці чалавеку няшчасце і "адорыць" начнымі кашмарамі.

На Русі таксама верылі ў магічную сілу снегавікоў. Таму прасілі іх паменшыць моцныя маразы. Але паколькі нашы продкі лічылі, што снегападамі, завірухамі кіруюць духі-жанчыны, то і ляпілі ў дварах снежныя фігуры жаночага полу — снежную бабу.

Дзіўны погляд на снегавікоў падае нам хрысціянская легенда. Менавіта яна абвяшчае, што снег – гэта дар неба, а снегавікі – гэта анёлы. Ім пад сілу перадаваць Богу малітвы і просьбы людзей.

Калі ж знянацку снежная баба адыгрывае галоўную ролю ў вашым казачным каляровым сне, будзьце ўпэўненыя – вас чакаюць выдатныя навіны, звязаныя з вашай другой палавінкай.

## Аксэсуары снегавікоў

Еўрапейцы добра закутваюць снегавіка ў шалікі, у рукі даюць густую мятлу і, вядома ж, ўпрыгожваюць гірляндамі.

Дзіўна, але некаторыя элементы снегавікоў маюць сімвалічнае значэнне. Нос з морквы мог задобрыць багоў урадлівасці і ўраджаю. Шапка ў выглядзе перавернутага вядра абяцала сям'і дастатак і багацце. Каралі з галовак часныку (румынскі звычай) здольныя абараняць сям'ю ад хваробы.

## Дзень снегавіка

Дарэчы, ушанаваць гэтага снежнага прыгажунчыка можна 18 студзеня, калі адзначаюць Дзень снегавіка.

***Матэрыял падрыхтавала Дудко Аляксандра***

# Падводзім вынікі першага паўгоддзя
















# 5 спосабаў дапамагчы птушкам перажыць зіму





***Многія людзі лічаць, што птушкам добра жывецца і без нас. Можа быць яно і так, але ў зімовы час яны проста маюць патрэбу ў нашай дапамозе. Вы можаце многае зрабіць, але нават самая маленькая дапамога, напрыклад, пакарміць птушак хлебнымі крошкамі, гэта ўжо добрая справа.***



## 1. Пакармі

Мабыць, гэта адзін з самых важных спосабаў дапамагчы птушкам перажыць зіму. Птушкі любяць збожжа, арэшкі, хлебныя крошкі. Сінічкам можна павесіць кавалачак сала.

## 2. Наліце вады

Для таго, каб паставіць міску з цёплай вадой, Вам спатрэбіцца ўсяго некалькі хвілін, і да таго ж гэта не цяжка зрабіць, ці не так?



## 3. Зрабіце прытулак

Птушкі будуць Вам удзячныя за любы прытулак для іх. Вы можаце купіць або зрабіць самі шпакоўню.

## 4. Не зразайце галоўкі кветак, якія адцвілі

Кожную восень усе садоўнікі зразаюць кветкі, не падазраючы аб тым, што гэта вельмі смачная ежа для птушак.

## 5. Пасадзіце расліны

Падумайце пра птушак задоўга да наступлення зімы. Пасадзіце ў сябе ў двары некалькі відаў раслін. Існуе мноства раслін, якія даюць ягады, плады і насенне, а гэта ідэальная ежа для птушак.

***Магчыма, гэта не ўсё спосабы дапамагчы птушкам перажыць зіму. Многія думаюць, што птушкі могуць паклапаціцца пра сябе самі, а я ўпэўнена, што ў свеце шмат добрых людзей, дзякуючы якім выжывае так многа птушак. А як Вы дапамагаеце птушкам перажыць зіму?***

*Матэрыял падрыхтавала*
*Лізавета Вайцяховіч*

# Навагоднія аб'екты














## *Памятка для бацькоў «Бяспечны новы год»*





*Новы год – самае вясёлае і доўгачаканае свята. Але каб навагоднія святы нічым не азмрочыліся, неабходна памятаць... Не, не толькі памятаць, а выконваць правілы пажарнай бяспекі.*



### *Ёлку трэба ўсталёўваць:*

- Далей ад батарэй ацяплення, каб яна не замінала вольна хадзіць па пакоі і не засланяла дзверы, якія вядуць у іншыя пакоі.
- Вярхушка елкі не павінна ўпірацца ў столь.
- Нельга ўпрыгожваць елку (сапраўдную ці штучную) цацкамі, якія лёгка запальваюцца, не варта абкладваць падстаўку пад елкай звычайнай ватай, упрыгожваць свечкамі.



Дарэчы, пры гарэнні штучнай елкі вылучаюцца вельмі шкодныя рэчывы. А кропелька палаючага пластыка, патрапіўшы на скуру, пакіне апёк больш глыбокі, чым сапраўдны распалены вугольчык. *Каб прадухіліць няшчасны выпадак, неабходна строга выконваць правілы карыстання піратэхнічнымі вырабамі.*



- Не варта набываць іх на аптовых рынках, у падземных пераходах ці электрацягніках.
- Нельга выкарыстоўваць піратэхнічныя вырабы з пашкоджаным корпусам.

### *Недапушчальна:*

- выкарыстоўваць піратэхнічныя вырабы пад нізкімі навесамі і кронамі дрэў,
- насіць такія вырабы ў кішэнях,
- накіроўваць ракеты і петарды на людзей,
- падыходзіць бліжэй, чым на 15 метраў, да запаленых феерверкаў,
- кідаць петарды пад ногі,
- выкарыстоўваць піратэхніку пры моцным ветры.

*Каб святочныя дні не былі азмрочаныя, выконвайце правілы пажарнай бяспекі.*

ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына